Ліст у нумар

# ШТО МОЖНА ЗАПАЗЫЧЫЦЬ НАШЫМ ФЕРМЕРАМ У АМЕРЫКАНСКІХ?

**На адрас рэдакцыі прыйшоў цікавы ліст ад кандыдата геаграфічных навук, дацэнта Пятра Ільіча РОГАЧА з Мінска.**

«З вялікім задавальненнем прачытаў артыкул пра слыннага фермера Мікалая Сіліна з Валожынскага раёна («Звязда», 14 чэрвеня 2011), — піша Пётр Ільіч. — Слушная яго думка: «Чым больш у Беларусі будзе фермераў, тым лепш». Але ж вельмі здзівіўся, калі даведаўся, што летась парэчкі зусім не збіраліся, агурочнік жа наогул зааралі. Прычына: вельмі нізкая цана на прадукцыю. Так, фермеру даводзіцца скрупулёзна падлічваць выдаткі і шукаць шляхі для іх змяншэння. Тут, мне здаецца, можна было б выкарыстаць вопыт амерыканскіх фермераў, якія і працаваць, і лічыць кожную капейку (цэнт) сапраўды ўмеюць.

Мне двойчы давялося пабываць у ЗША. Паездкі былі даволі працяглыя, пашанцавала пабыць і на амерыканскіх фермах.

Амерыканскія фермеры для ўборкі ягад (клубніц, буякоў, парэчак), садавіны і агародніны шырока выкарыстоўваюць рабочую сілу, якая не каштуе ім ні цэнта. Як толькі ў фермера паспявае ўраджай, ён рассылае па электроннай пошце мясцовым жыхарам паведамленне: «Калі ласка, прыязджайце збіраць ураджай». Або дае адпаведную рэкламу ў прэсе.

Дзесьці ў пачатку жніўня мая нявестка атрымала такое паведамленне: «Міс Н., паспяваюць буякі. Калі вы хочаце сабраць лепшыя ягады, то чакаем Вас». Ферма, на якую мы паехалі, знаходзіцца ў прыгарадзе. Плошча яе — 0,84 гектара. Нам кожнаму далі поліэтыленавае вядро з поліэтыленавым пакетам і мы адправіліся на плантацыю. Ягад збіраеш колькі хочаш, і есці можна. Ніхто за гэтым не сочыць. Набралі ягад, падыходзім да рабочага месца, дзе фермеры — муж і жонка — сабраны ўраджай узважваюць і тут жа робяць разлік. Кожнаму зборшчыку даецца адмысловая картка, дзе паведамляецца, што калі другі раз мы наведаем ферму, то нам будзе зніжка з кошту 25 цэнтаў. Для апылення буякоў фермер трымае пчол. Таму тут жа можна набыць мёд, прапаліс. Ляжаць раздрукаваныя паперкі з рэцэптамі: што можна рабіць з буякоў.

Думаецца, што і ў нас знайшліся б ахвотнікі, якія б збіралі ягады (садавіну, агародніну) за тое, што ім прададуць тыя ж парэчкі па 1600 рублёў за кілаграм. Дайце, фермеры, толькі адпаведную інфармацыю: адбою не будзе. Але лепш чамусьці заараць... Так мы ніколі багатымі не будзем».

**Падрыхтавала Надзея ДРЫЛА.**

# ЗАМЯНІЛІ ПОМПУ, ДАЛІ ЦІСК. У ДВУХ МЕСЦАХ ЛОПНУЎ ВОДАПРАВОД...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Янушкавічы Лагойскага раёна паскардзіліся на праблему з водазабеспячэннем. Населены пункт даволі вялікі, і пэўны час частка насельнікаў (нам пералічылі вуліцы) пакутуе ад адсутнасці вады. Яе папросту няма, як сказалі заяўнікі, апошнія шэсць тыдняў. Людзі звярталіся і ў сельскі Савет, і ў мясцовы камунгас, і на «гарачую лінію» райвыканкама, аднак сітуацыя да лепшага з месца не зрушыла. Чытачы выклалі сваю версію таго, што адбываецца зараз у Янушкавічах з вадой. Некалі на вёску было дзве воданапорныя вежы, потым адна выйшла са строю. На 2009 год было запланавана будаўніцтва новай вежы, ды нешта не атрымалася. А калодзежаў у вёсцы няма, гаварылі нам заяўнікі...**

Праблема, на жаль, у многім тыповая. Калі згадваць такія сітуацыі, як правіла, водаправод быў пракладзены яшчэ ў далёкія савецкія часы, а потым знаходзіўся на балансе мясцовай гаспадаркі (як варыянт зараз — на балансе камунгаса). Фінансаў, натуральна, на капітальную замену сетак (а за дзесяцігоддзі яны цалкам знасіліся, і карэнным чынам праблему часцей можна вырашыць толькі так) ні ў першай, ні ў другога няма... Магчымасці абмежаваны толькі рамонтам ці заменай помпы. Яшчэ які кавалак водаправода могуць замяніць у выключных выпадках. Толькі ці выйсце гэта? Замененая помпа дасць ціск у трубы, і тыя недзе абавязкова «паляцяць». Прыкладна так мы разважалі падчас звароту заяўнікаў. Гаварылі, што мясцовыя ўлады не могуць не ведаць пра беды вяскоўцаў, толькі фінансавыя магчымасці і ў іх, на жаль, абмежаваныя. Гаварылі, паўтаруся, прыкладна — як яно звычайна бывае. А выйшла дакладна так на самой справе, пра што нам распавёў у тэлефоннай гутарцы **намеснік старшыні Лагойскага райвыканкама Сяргей СТРАЖНІКЕВІЧ**.

Пацвердзіў і пра абмежаваныя фінансавыя магчымасці. У прыватнасці, Янушкавічы былі ўключаны ў рэспубліканскую праграму «Чыстая вада». Аднак потым фінансаванне яе было прыпынена. Даводзіцца «латаць» стары водаправод сваімі сіламі. Паралельна Сяргей Мікалаевіч набраў нумар дырэктара камунгаса і задаў пытанне: ці выкананы рамонтныя работы ў Янушкавічах або людзі яшчэ без вады? У адказ пачуў і перадаў нам, што ў вёсцы ў панядзелак паставілі новую помпу. Уключылі. І што? Адбылося тое, пра што мы разважалі вышэй: на водаправодзе ўтварыліся два парывы... У аўторак, на момант нашай гутаркі, даць туды тэхніку і людзей на выпраўленне сітуацыі не было магчымасці: яны былі патрэбныя ў іншым месцы. Сяргей Мікалаевіч сказаў, што на аб'екце яны з'явяцца ў сераду...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# 25 гадоў, як пахаваў родзіча? Плаці падатак за магілу!

Кіраўніцтва УП «Спецкамбінат КБА» прапаноўвае на заканадаўчым узроўні вырашыць праблему недагледжаных магіл на мінскіх могілках.

— Яна вельмі актуальная, — адзначыў дырэктар прадпрыемства Мікалай Ракевіч. — У межах сталіцы 17 могілак, і большасць з іх — былыя вясковыя, старыя. Пры гэтым толькі 30 працэнтаў магіл сваякі перыядычна наведваюць і прыводзяць у парадак.

У адпаведнасці з дзейным заканадаўствам, устаноўленыя на могілках помнікі з'яўляюцца ўласнасцю родных памерлага, а пры іх адсутнасці — уласнасцю юрыдычных або фізічных асоб, якія паставілі гэтыя помнікі. Згодна з правіламі ўтрымання месцаў пахавання, адміністрацыя спецыялізаванай арганізацыі абавязана паведамляць сваякам пахаванага пра надмагільныя помнікі, пліты калумбарных ніш, якія могуць разбурыцца, і патрабаваць іх выпраўлення ў кароткія тэрміны. Аднак на практыцы не заўсёды ёсць магчымасць адшукаць такіх грамадзян, а тым больш прыцягнуць іх да работ па добраўпарадкаванні магіл.

— Мы вывучаем замежны вопыт, — сказаў Мікалай Ракевіч. — Напрыклад, у Швейцарыі праз 25 гадоў пасля пахавання родныя павінны плаціць штогод падатак, калі жадаюць і надалей даглядаць магілу. У адваротным выпадку надмагільны помнік зносяць, астанкі эксгумуюць і крэміруюць, а урну з прахам хаваюць у агульную магілу. Месца, якое вызвалілася, аддаюць іншым.

Паводле слоў кіраўніка УП «Спецкамбінат КБА», спецыялісты прадпрыемства рыхтуюць прапановы аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у закон «Аб пахаванні і пахавальнай справе», дзе абазначаць варыянты вырашэння праблемы закінутых магіл.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,**
*«Мінск—Навіны».*

## «ПРАЦАВАЎ» НА ДАЧАХ

Адразу дзве дачніцы паведамілі ў Талачынскі РАУС аб тым, што з іх дачных дамоў у вёсцы Курапава скралі маёмасць. У адной — дрэваапрацоўчы станок, адзенне, абутак, прадукты харчавання, у другой — прас і магнітафон. Незнаёмец узламаў дзвярныя запоры і трапіў у дамы. Ва ўчыненнях крадзяжоў падазраюць 40-гадовага мужчыну раней судзімага, беспрацоўнага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«Банк, основанный на доверии»
ЗАО «Трастбанк»
220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2011 | 01.01.2011 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 14 640,3 | 15 406,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 325,7 | 636,9 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 128 569,4 | 33 722,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 82 633,6 | 59 909,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 3 090,9 | 3 045,2 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 255 602,4 | 257 032,1 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 2 189,9 | 2 189,9 |
| 10 | Инвестиции в зависимое юридическое лицо | | 2 012,8 | 1 689,4 |
| 11 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 44 589,6 | 44 955,1 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1111 | 18 277,9 | 18 085,5 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 551 932,5 | 436 672,0 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 45 348,5 | 15 065,8 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 12 369,5 | 21 780,1 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 359 577,1 | 265 850,6 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 27 535,1 | 27 118,4 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 1 950,1 |
| 21 | Прочие обязательства | 1206 | 8 239,8 | 10 051,7 |
| 22 | ВСЕГО обязательства | 120 | 453 070,0 | 341 816,7 |
| 23 | КАПИТАЛ | | | |
| 24 | Уставный фонд | 1211 | 48 785,7 | 48 785,7 |
| 25 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 26 | Резервный фонд | 1213 | 4 880,1 | 4 880,1 |
| 27 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 32 176,1 | 32 176,1 |
| 28 | Накопленная прибыль | 1215 | 13 020,6 | 9 013,4 |
| 29 | Всего капитал, принадлежащий головной организации - банку | | 98 862,5 | 94 855,3 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | 98 862,5 | 94 855,3 |
| 31 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 551 932,5 | 436 672,0 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за январь – март 2011 года

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2011 | 01.04.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 8 834,8 | 9 880,7 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 058,9 | 6 797,4 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 775,9 | 3 083,3 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 10 595,0 | 11 010,6 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 178,3 | 321,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 9 416,7 | 10 689,5 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 64,0 | 23,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 1 239,6 | (587,6) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (473,3) | 713,1 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 1 459,9 | 8 383,3 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 568,4 | 526,9 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 424,0 | 5 061,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 826,4 | 714,9 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 881,0 | 289,2 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 197,2 | |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 683,8 | 289,2 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | 168,6 | 24,6 |
| 19 | Итого прибыль (убыток) | | 3 852,4 | 313,8 |

**Председатель Правления ЗАО «Трастбанк»** **Ю.М. Каштанов**

**Главный бухгалтер** **Н.В. Бродик**

**Дата подписания 13 мая 2011 г.**

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 13.11.2008 г. НБ РБ.

Организация: **ИП «Юнивест-М» консолидированный**
Учетный номер плательщика: **800009861**
Вид деятельности: **оптовая торговля**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **Юридическое лицо без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн. руб.**
Адрес: **220005, г. Минск, ул. Гикало, д. 3**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 г.

| АКТИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 37 624 | 49 110 |
| амортизация | 102 | 4 526 | 7 040 |
| остаточная стоимость | 110 | 33 098 | 42 070 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 2 964 | 2 958 |
| амортизация | 112 | 234 | 296 |
| остаточная стоимость | 120 | 2 730 | 2 662 |
| Доходные вложения в материальные ценности | | | |
| первоначальная стоимость | 121 | | - |
| амортизация | 122 | | - |
| остаточная стоимость | 130 | | - |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 34 013 | 37 527 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 33 209 | 36 981 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **69 841** | **82 259** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 61 738 | 33 648 |
| в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 26 445 | 4 686 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты | 213 | 138 | - |
| расходы на реализацию | 214 | 774 | 129 |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 16 406 | 13 856 |
| товары отгруженные | 216 | | |
| выполненные этапы по незавершенным работам | 217 | | |
| расходы будущих периодов | 218 | 17 975 | 14 977 |
| прочие запасы и затраты | 219 | | |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 220 | 177 | 2 474 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты) | 230 | | |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | | |
| прочая дебиторская задолженность | 232 | | |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 240 | 131 266 | 47 602 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 22 798 | 23 104 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 46 874 | 10 336 |
| по налогам и сборам | 243 | 41 281 | 10 022 |
| по расчетам с персоналом | 244 | 1 131 | 1 776 |
| разных дебиторов | 245 | 19 182 | 2 364 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | | |
| Расчеты с учредителями | 250 | | |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 251 | | |
| прочие | 252 | | |
| Денежные средства | 260 | 39 243 | 5 557 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 261 | 34 254 | 4 370 |
| Финансовые вложения | 270 | 17 502 | 13 788 |
| Прочие оборотные активы | 280 | | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **249 926** | **103 069** |
| **БАЛАНС (190+290)** | **300** | **319 767** | **185 328** |
| ПАССИВ | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 27 | 27 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | | |
| Резервный фонд | 420 | 2 | 2 |
| в том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 421 | 2 | 2 |
| резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами | 422 | | |
| Добавочный фонд | 430 | 57 386 | 64 883 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | | - |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 13 002 | 11 724 |
| Целевое финансирование | 460 | | |
| Доходы будущих периодов | 470 | | |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **70 417** | **76 636** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 8 761 | 92 483 |
| Прочие долгосрочные обязательства | 520 | | |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **8 761** | **92 483** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 196 602 | 9 250 |
| Кредиторская задолженность | 620 | 43 930 | 6 949 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 6 169 | 577 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 26 827 | 1 944 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 387 | 318 |
| по прочим расчетом с персоналом | 624 | - | - |
| по налогам и сборам | 625 | 6 061 | 1 970 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 112 | 66 |
| по лизинговым платежам | 627 | | |
| перед прочими кредиторами | 628 | 4 374 | 2 074 |
| Задолженность перед участниками (учредителями) | 630 | | |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 631 | | |
| прочая задолженность | 632 | | |
| Резервы предстоящих расходов | 640 | | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 650 | 57 | 10 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **240 589** | **16 209** |
| **БАЛАНС (490+590+690)** | **700** | **319 767** | **185 328** |
| Из строки 620: | | | |
| долгосрочная кредиторская задолженность | 701 | | |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 43 930 | 6 949 |

| Активы и обязательства, учитываемые за балансом | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Арендованные (в том числе полученные в пользование, лизинг) основные средства | 001 | 19 | - |
| Товарно-материальные ценности, принятые на ответственное хранение | 002 | 7 | 74 |
| Материалы, принятые в переработку | 003 | | |
| Товары, принятые на комиссию | 004 | | |
| Оборудование, принятое для монтажа | 005 | | |
| Бланки строгой отчетности | 006 | | |
| Списанная в убыток задолженность неплатежеспособных дебиторов | 007 | 7 536 | 7 572 |
| Обеспечения обязательств и платежей полученные | 008 | | |
| Обеспечения обязательств и платежей выданные | 009 | 83 930 | 50 938 |
| Амортизационный фонд воспроизводства основных средств | 010 | 55 | 939 |
| Основные средства, сданные в аренду (лизинг) | 011 | | |
| Нематериальные активы, полученные в пользование | 012 | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | - | 7 |
| Потеря стоимости основных средств | 014 | 35 | 34 |

Организация: **ИП «Юнивест-М» консолидированный**
Учетный номер плательщика: **800009861**
Вид деятельности: **оптовая торговля**
Организационно-правовая форма: **частная**
Орган управления: **Юридическое лицо без ведомственной подчиненности**
Единица измерения: **млн.руб.**
Адрес: **220005, г. Минск, ул. Гикало, д. 3**

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 177 249 | 1 084 978 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 27 064 | 201 198 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011) | 020 | 150 185 | 883 780 |
| Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах | 021 | - | - |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 122 248 | 767 306 |
| Валовая прибыль (020-021-030) | 040 | 27 937 | 116 474 |
| Управленческие расходы | 050 | 7 379 | 10 136 |
| Расходы на реализацию | 060 | 14 247 | 132 449 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)** | **070** | **6 311** | **-26 111** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 080 | 35 918 | 248 046 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 081 | 343 | 63 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081) | 090 | 35 575 | 247 983 |
| в том числе: проценты к получению | 091 | 609 | 328 |
| доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций | 092 | | |
| доходы от операций с активами | 093 | 34 913 | 237 871 |
| прочие операционные доходы | 099 | 53 | 9 784 |
| Операционные расходы | 100 | 35 248 | 238 359 |
| в том числе: проценты к уплате | 101 | 115 | - |
| расходы от операций с активами | 102 | 34 964 | 238 121 |
| прочие операционные расходы | 109 | 169 | 238 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090-100)** | **120** | **327** | **9 624** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 6 796 | 57 579 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 34 | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131) | 140 | 6 762 | 57 578 |
| Внереализационные расходы | 150 | 13 763 | 75 053 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)** | **160** | **-7 001** | **-17 475** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)** | **200** | **-363** | **-33 962** |
| Расходы, не учитываемые при налогообложении | 210 | 747 | 3 579 |
| Доходы, не учитываемые при налогообложении | 220 | 3 | - |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)** | **240** | **381** | **-30 383** |
| Налог на прибыль | 250 | 45 | - |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 260 | 556 | 254 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 270 | 13 | 7 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)** | **300** | **-977** | **-34 223** |
| Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 310 | - | - |
| Прибыль (убыток) на акцию | 320 | - | - |
| Количество прибыльных организаций | 330 | 0 | 0 |
| сумма прибыли | | 0 | 0 |
| Количество убыточных организаций | 340 | 1 | 1 |
| сумма убытка | | -977 | -34 223 |

## РАСШИФРОВКА ОТДЕЛЬНЫХ ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫХ ДОХОДОВ И РАСХОДОВ

| Показатель | | За отчетный период | | За аналогичный период предыдущего года | |
|---|---|---|---|---|---|
| наименование | код | доход | расход | доход | расход |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Штрафы, пени и неустойки, признанные или по которым получены решения суда (арбитражного суда) об их взыскании | 350 | 1 115 | 416 | - | 538 |
| Прибыль (убыток) прошлых лет | 360 | 3 | 21 | - | 335 |
| Возмещение убытков, причиненных неисполнением или ненадлежащим исполнением обязательств | 370 | | - | - | - |
| Курсовые разницы по операциям в иностранной валюте | 380 | 4 700 | 11 828 | 45 360 | 67 217 |
| Списание дебиторских и кредиторских задолженностей, по которым истек срок исковой давности | 390 | 167 | 59 | 551 | 900 |
| Прочие доходы и расходы | 400 | 777 | 1 439 | 11 667 | 6 063 |
| **ИТОГО** | **500** | **6 762** | **13 763** | **57 578** | **75 053** |

**Руководитель** **В.Н. Здобнов**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Шатровская**

**29 марта 2011 г.**

## КАЛІ ВЕЗЦІ, ДЫК НА МІЛЬЯРД

На памежным пункце пропуску «Казловічы» ў Брэсце мытнікі праверылі грузавы аўтамабіль «Сканія». Акрамя задэклараванага грузу там аказалася 13 прыхаваных цюкоў з імпартным адзеннем. Нелегальна ў Беларусь везлі замежны трыкатаж на суму звыш аднаго мільярда рублёў. Кантрабанда затрымана.

**Яна СВЕТАВА.**

## ЗАТРЫМАЛІ НА МЕСЦЫ ЗЛАЧЫНСТВА

У вёсцы Сакалоўшчына Верхнядзвінскага раёна ў краме райпа ноччу — а другой гадзіне — спрацавала сігналізацыя. Міліцыянеры прыехалі на месца хутка і ля крамы з доказамі злачынства затрымалі грамадзяніна, які ўжо паспеў «затаварыцца». Злодзей спрабаваў знесці з крамы прадукты харчавання, спіртныя напоі і цыгарэты на агульную суму звыш мільёна рублёў. Высветлілася, што на злачынства пайшоў раней ужо судзімы за крадзяжы, беспрацоўны, 1966 года нараджэння жыхар вёскі Сялко.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Уважаемые жители Советского района г. Минска!**
**Администрация Советского района г. Минска**
**ПРИГЛАШАЕТ ВАС ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОВЕДЕНИИ ОБЩЕСТВЕННОГО ОБСУЖДЕНИЯ ПРОЕКТА**
**«Строительство многоквартирного жилого дома по ул. Золотая Горка, 6А».**

Заказчик разработки проекта — ИП «Атлант-М Строй» (Жуковец Сергей Федорович — ведущий инженер предприятия, тел. 8(029)6495097), разработчик — ИП «Атлант-М Строй» (Царенко Константин Анатольевич — ГАП проекта, тел. 8(029)6566533).

**Презентация проекта состоится 04.07.2011 в 18.00 в средней школе № 19 по ул. Золотая Горка, 18 (конференц-зал).**

В период **с 05.07.2011 по 19.07.2011** свои письменные замечания и предложения по проекту Вы вправе направлять в администрацию Советского района г. Минска (ул. Дорошевича, 8) с пометкой «общественное обсуждение», либо оставлять по месту дальнейшего размещения экспозиции указанного проекта (СШ № 19 по ул. Золотая Горка, 18) в специальной урне.

Координаты представителя организатора общественного обсуждения проекта (администрация Советского района г. Минска) — начальник отдела архитектуры и градостроительства Шацкая Вероника Николаевна (г. Минск, ул. Дорошевича, 8, каб. 24, тел. 292 81 80). УНП 800005787

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09.***

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

В течение трех предшествующих лет ОДО «Айрон», как заказчиком строительства были построены следующие объекты:

в 2008 году:

жилой дом № 26 по ул. Игуменский тракт в г. Минске;

в 2009 году:

жилой дом № 11Д по ул. Высокая в г. Минске;

в 2010 году

жилой дом № 11 по ул. Связистов в г. Минске (1 пусковой комплекс)

**Информация о проекте строительства.**

**Цель строительства** – строительство 19-этажного односекционного жилого дома со встроенными объектами торгово-общественного назначения в комплексе с временной охраняемой автостоянкой по ул. Карвата в Степянке.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**19-этажный односекционный жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения в комплексе с временной охраняемой автостоянкой по ул. Карвата в Степянке**

Строительство осуществляется с выделением следующих этапов:

первая очередь строительства: - жилой дом со встроенными объектами торгово-общественного назначения (жилая часть – первый пусковой комплекс, встроенные объекты торгово-общественного назначения – второй пусковой комплекс);

вторая очередь строительства: - временная охраняемая автостоянка.

Начало строительства – первый квартал 2011 года, окончание строительства жилой части – 2 квартал 2012 года.

Застройщиком получены:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – акт выбора земельного участка от 13 июля 2010 года, утвержден председателем горисполкома 14 июля 2010 года;

- заключение Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома № 01-25/3 Пт от 25.01.2010 г.;

- заключение государственной экспертизы (РУП «Госстройэкспертиза по городу Минску») архитектурного проекта с рекомендацией к утверждению проекта № 1333-60/10 от 30.11.2010 г.;

- положительное заключение Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома № 04-15/36Пт от 15.04.2011 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета № 81(1) от 20 января 2011 года «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/726-7126 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000001005378, расположенный по адресу г. Минск, ул. Карвата, площадью 1,0220 га, на период строительства многоэтажного жилого дома;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-205Ж-002/11 от 31.03.2011 г.

**Жилой дом** расположен по улице Карвата в микрорайоне Степянка в г. Минске (первая очередь). Проектом предусматривается строительство 126-квартирного, односекционного, 19, 20-этажного жилого дома, со встроенными помещениями торгово-общественного назначения. Несущие конструкции здания запроектированы в монолитном железобетонном каркасе, ограждающие конструкции из мелкоштучных блоков ячеистого бетона, кровля совмещенная рулонная. Наружная отделка – декоративная полимерная штукатурка, покраска фасадными красками. Оконные блоки двухкамерные стеклопакеты ПВХ, лоджии и балконы остеклены. В помещениях квартир чистовая отделка и покрытие пола проектом не предусматривается. Жилой дом оборудован 2 лифтами, мусоропроводом.

Помещения в доме, не входящие в состав общего имущества: помещения торгово-общественного назначения и объекты которые служат использованию этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения).

**В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности**, после ввода в эксплуатацию жилого дома и передаче дольщикам объектов долевого строительства, входят:

помещения инженерного назначения (электрощитовые, машинные отделения, мусоросборники, тепловые пункты, лифтовые шахты, водомерный узел); межквартирные лестничные клетки, коридоры общего пользования, лифтовые холлы, вестибюли, межэтажные лестницы и переходные незадымляемые балконы, лифты, тамбуры, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства, две открытые парковки на 19 и 15 машино-мест.

Стоимость строительства открытой охраняемой автомобильной стоянки на 58 машино-мест не включается в стоимость 1 кв.метра стоимости жилого дома и не передается дольщикам в качестве имущества совместного домовладения.

**Генеральный подрядчик по объекту строительства ООО «ДомСтройАгент». Договор строительного подряда № 3-11 от 19.01.2011 г. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются 1-,2-,3-,4-комнатные квартиры:**

**для граждан, состоящих и не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц** стоимость создания 1 кв. метра 4040157 (четыре миллиона сорок тысяч сто пятьдесят семь) белорусских рублей на дату опубликования проектной декларации без прибыли застройщика и без услуг застройщика по обеспечению строительства (эксплуатации).

**Условия оплаты** – первоначальный взнос 20% в течение 5 календарных дней с момента подписания договора долевого строительства.

**Ознакомление дольщиков с планировками квартир**, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется в рабочее время ОДО «Айрон» по адресу: г. Минск, проспект Победителей, д. 89, кор. 2, помещение 10, каб. 18, 41. ***Тел. 8 (017) 216 00 09. Официальный сайт www.airon.by***

# Краіна здароўя

Выпуск № 32 (268)

## Лечымся без лекаў

# КРОП СТЫМУЛЮЕ АПЕТЫТ



**ПАГАДЗІЦЕСЯ, цяжка ўявіць дачны ўчастак без градкі з кропам. Звычайна ўладальнікі шасці сотак вырошчваюць яго для таго, каб выкарыстоўваць у далейшым у ежу. Між тым яшчэ з часоў Авіцэны гэтая гаючая расліна шырока ўжывалася ў народнай медыцыне для лячэння як сур'ёзных захворванняў, так і лёгкіх недамаганняў.**

Кроп аказвае на арганізм рознабаковае лекавае дзеянне. Ён валодае гіпатэнзіўным, спазмалітычным і заспакаяльным эфектам, таму яго рэкамендуецца выкарыстоўваць пры пачатковых стадыях гіпертанічнай хваробы, стэнакардыі, а таксама пры неўрозах і бяссонніцы. Здаўна кроп лічыцца добрым мачагонным, жаўцягонным, адхарквальным сродкам. Ён дапамагае пры кішэчных кoліках, метэарызме, пры захворваннях печані.

Трава кропу павышае супраціўляльнасць арганізма да інфекцыйных і прастудных захворванняў, паляпшае апетыт. Кроп стымулюе дзейнасць малочных залозаў, таму ён вельмі карысны кормячым жанчынам.

Добра зарэкамендаваў сябе кроп і ў касметалогіі. Прыгатаваныя на аснове кропу прэпараты дапамагаюць не толькі палепшыць стан скуры, але і пазбавіцца ад некаторых скурных захворванняў.

Гаючыя ўласцівасці кропу абумоўленыя яго складам. Кроп змяшчае шмат клятчаткі, карацін, солі кальцыю, магнію, фосфару і жалеза, вітаміны С, РР, $B_1$ і $B_2$, фоліевую і нікацінавую кіслоты. Акрамя таго, усе часткі расліны багатыя на эфірны алей. Асабліва шмат яго ў пладах (насенні) кропу.

● Настой або парашок з насення кропу выкарыстоўваюць для папярэджання прыступаў *стэнакардыі, пры гіпертанічнай хваробе I—II ступені, пры лячэнні алергічных дэрматытаў*, хранічнай сардэчнай недастатковасці, для здымання сутаргаў.

Для прыгатавання настою 2 ст. лыжкі стоўчаных пладоў заліваюць 2 шклянкамі кіпеню, настойваюць 30 хвілін, працэджваюць і п'юць па 100 мл 2—3 разы на дзень.

● Пры *атэрасклерозе*, які суправаджаецца моцнымі галаўнымі болямі, настой кропу прымаюць па 1/3 або па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень.

● Лісце кропу заварваюць і п'юць як гарбату пры *анеміі і сардэчнай астме*.

● Пры *метэарызме* 1 ст. лыжку насення заліць шклянкай гатаванай вады, настойваць 10—15 хвілін, затым працадзіць і прымаць па 1 ст. лыжцы за 15 хвілін да яды. Прыгатаваны па такім жа рэцэпце настой можна выкарыстоўваць у якасці *адхарквальнага* або *лёгкага мачагоннага* ў той жа дазіроўцы.

● Для *паляпшэння апетыту* 1 ч. лыжку здробненага насення кропу заліць шклянкай кіпеню, настойваць 30 хвілін і піць па 30—50 мл 3—4 разы на працягу дня.

● Пры *цыстыце* 2 ст. лыжкі насення кропу заліць 400 мл кіпеню, настойваць 30 хвілін і піць па 100 мл 3—4 разы на дзень.

● Насенне кропу, зваранае ў чырвоным віне (50 г насення на 0,5 л віна), добра дапамагае пры *бяссонніцы*. Доза прыёму — па 50—100 мл на ноч.

● Пры *захворваннях печані і жоўцевых шляхоў* прымаюць настой пладоў па 1 ст. лыжцы 3—6 разоў на дзень за 15 хвілін да яды ў халодным выглядзе. Для гэтай жа мэты прымяняюць і адвар травы. Яго п'юць па 1/3 шклянкі 3 разы на дзень да яды.

Настой пладоў: 1 ст. лыжку сухой сыравіны заліваюць шклянкай кіпеню, настойваюць 15 хвілін, працэджваюць і адціскаюць.

● Пры *гемароі* траву кропу абліць кіпенем, астудзіць, пакласці на складзеную ў 2—3 столкі марлю і прыкладваць да гемараідальных вузлоў.

● Адвар расліны рэкамендуецца піць пры *болях у вобласці паясніцы*. Для гэтага ўсю расліну (сцёблы, лісце, плады) высушыць, здрабніць, 1 ст. лыжку сухой сыравіны заліць шклянкай кіпеню, настойваць 1 гадзіну, працадзіць і піць па 0,5 шклянкі 3—4 разы на дзень.

● Калі мужчына раптам стаў адчуваць сябе няўпэўнена напярэдадні чаканай блізкасці з жанчынай, яму трэба кожны дзень з'ядаць па невялікім пучку свежага зяленіва кропу або па невялікай жмені сухога насення. Да таго ж сухое насенне кропу хутка здымае стомленасць пасля празмернай фізічнай нагрузкі.

● Можна выкарыстаць і такі народны рэцэпт: 1 ст. лыжку сухога насення кропу заліць шклянкай гатаванай вады, настойваць 15 хвілін, працадзіць, прымаць настой па 1 ст. лыжцы 5—6 разоў на дзень да яды. Праз 7 дзён зрабіць перапынак на 3—4 дні і паўтарыць. Лячэнне працягваць такімі курсамі да таго часу, пакуль ад боязі і няўпэўненасці ва ўласных сілах перад ноччу кахання не застанецца і следу.

● Адвар для амаладжэння і аздараўлення. Вазьміце па жменьцы лісця маліны, чорных парэчак, хмелю, 1 ст. лыжку здробненага насення кропу, дадайце 1 ст. лыжку сухой яблычнай лупіны. Заліце сумесь літрам вады, давядзіце да кіпення і паварыце 10 хвілін. Астудзіце і піце па шклянцы раніцай нашча і на ноч.

**У касметалогіі кроп выкарыстоўваецца як у свежым, так і ў сушаным выглядзе.**

● Адвар насення кропу і суквеццяў рамонку выкарыстоўваюць для праціранні пры *раздражнёнай скуры*, а таксама пры *вугрыстым сыпе*. Узяць роўную колькасць суквеццяў рамонку і насення кропу, змяшаць, 1 ст. лыжку гэтага збору заліць шклянкай вады, кіпяціць 5 хвілін, настойваць на працягу 1 гадзіны, працадзіць і праціраць твар 2—3 разы на дзень.

● Змяшаць 0,5 шклянкі дробна парэзанага кропу, 20 г гліцэрыны, 100 мл 70-градуснага спірту, даць пастаяць 3 сутак, працадзіць і дадаць у настойку 100 мл дыстыляванай вады. Атрыманым ласьёнам праціраць твар раніцай і ўвечары.

● *Стомленым і раздражнёным вачам* дапамагаюць кампрэсы з адвару кропу: 1 ст. лыжку травы заліць шклянкай кіпеню, настойваць 15—20 хвілін, працадзіць. Змочаныя кропавым адварам сурвэткі або ватныя тампоны накладваць на вочы на 2—3 хвіліны. У дзень пажадана праводзіць 3—4 працэдуры.

**Увага!** Лячэнне прэпаратамі з кропу трэба з асцярожнасцю праводзіць людзям з паніжаным ціскам. У гіпатонікаў празмернае ўжыванне кропу можа справакаваць страту прытомнасці, часовае пагаршэнне зроку і агульны ўпадак сіл.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## Інфарм-укол

# І Ў ПУСТАЗЕЛЛІ НЕШТА ЁСЦЬ

**З пустазеллем можна змагацца, а можна і скарыстацца яго карыснымі вартасцямі. Старшая медсястра 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Юлія КРАСІЛЬНІКАВА прапануе ўзяць на ўзбраенне наступную інфармацыю.**

**ТРЫПУТНІК ВЯЛІКІ** аказвае спрыяльнае дзеянне пры язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, гастрытах, калітах, цукровым дыябеце. Ён танізуе, павышае апетыт, настрой, працаздольнасць.

Салат з трыпутніку. Маладое лісце трыпутніку, зялёная ці рэпчатая цыбуля, яйка, лыжка цёртага хрэну, смятана, соль, сок лімона. Перад гатаваннем крапіву і трыпутнік акунуць у кіпень, даць сцячы вадзе, здрабніць.

**ЦЫКОРЫЯ**, залічаная да пустазелля, здаўна ўжываецца ў многіх краінах. З яе гатуюць салаты з яблыкамі, чырвоным перцам, зялёным гарошкам, салёнай і свежай капустай. Цыкорыю падаюць у тушаным выглядзе з яйкам, смажанай бульбай, цёртым сырам, у амлеце, а яе карані ідуць у асноўным на выраб заменніка кавы.

Салат з цыкорыі. Маладыя парасткі цыкорыі, маргарын, соль. Цыкорыю добра прамыць, нарэзаць кавалкамі па 2-3 см, тушыць з маргарынам 20 хвілін, даць астыць, дадаць пятрушку.

Супавая запраўка. Прамытае лісце цыкорыі здрабніць, пасаліць, выкарыстоўваць для запраўкі супоў з разліку 1 ст. лыжка на порцыю супу.

Супрацьзапаленчымі, антысептычнымі, супрацьвіруснымі ўласцівасцямі валодае **КАЛЕНДУЛА**. У народнай медыцыне прымяняецца ў розных відах (прымочкі, мазі, паласканні і інш.), асабліва пры апёках, псарыязе, фурункулёзе, язвавых працэсах, бародаўках, мазалях, гіперкератозе і інш. Кветкі календулы можна выкарыстоўваць у якасці гарніру да тушаных страў, для запраўкі супоў, салаты.

Салата з календулай. 500 г варанай бульбы, 50 г зялёнай цыбулі, 15 кветак календулы, 100 г салатнай запраўкі (алей, воцат, цукар, перац, соль). Бульбу нарэзаць, перамяшаць з цыбуляй і календулай, паліць запраўкай.

Па харчовай каштоўнасці **ЛОПУХ** можна параўнаць з морквай, пятрушкай і пастарнакам. Карані лопуху можна класці ў суп замест бульбы, рабіць з іх катлеты і аладкі.

Салата з лопуху. Лісце лопуху, хрэн, зялёная цыбуля, смятана, соль. Прамытае лісце лопуху апусціць на 1-2 хвіліны у кіпень, абсушыць, здрабніць, перамяшаць з цыбуляй, пасаліць, дадаць цёрты хрэн і заправіць смятанай.

Суп з лісця лопуху. Бульбу і рыс варыць да гатоўнасці. Дадаць здробненае лісце лопуху і смажаную цыбулю. Такі суп лічыцца карысным пры хваробах страўнікава-кішачнага тракту.

**ФІЯЛКА ТРОХКОЛЕРНАЯ** (браткі) аказвае антысептычнае дзеянне пры паталогіі страўнікава-кішачнага тракту, узмацняе сакрэцыю бранхіяльных залоз, спрыяе вывядзенню макроты. Прэпараты браткоў прымяняюць як самастойна ў выглядзе настояў і адвараў, так і ў сумесі з іншымі лекавымі раслінамі аналагічнага дзеяння.

**ВАЎЧКІ ТРОХРАЗДЗЕЛЬНЫЯ** валодаюць мачагоннай, патагоннай, супрацьзапаленчай уласцівасцямі, нармалізуюць абмен рэчываў. Для прыёму ўнутр гатуюць настой травы ваўчкоў, які выкарыстоўваецца ў дэрматалагічнай практыцы. Вядома і пра эфектыўнасць прэпаратаў ваўчкоў у лячэнні псарыязу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Хваробы ад нерваў і задавальнення: як вылечыць першыя і не атрымаць другіх

«Прамая лінія»

*(Працяг. Пачатак у нумары за 18 чэрвеня.)*

**НА пытанні чытачоў адказаў урач-дэрматавенеролаг, загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір ЯРОМІЧ.**

***☎— Алена, Нясвіж. У мяне герпеавірус, болькі на скуры. Прызначылі прэпараты, прымала іх сем дзён, але дапамагло мала. Што вы можаце параіць?***

— Скура аднаўляецца праз 3—4 тыдні. Проста вы не правялі курс лячэння да канца. Але без агляду параіць нешта вельмі складана. Вам трэба вырашаць пытанне з урачом па месцы жыхарства.

***☎— Наталля, Мінск. У маёй мамы дысгідратычная экзэма. Нядаўна яна абвастрылася зноў. Ад чаго гэта можа быць, дзе можна лячыць і ўвогуле, ці можна яе вылечыць?***

— У Мінску на базе гарадскога скурвендыспансэра працуе кансультацыйны цэнтр, тэл. для даведак: (8017) 372 73 81, дзе кансультуюць спецыялісты. Калі вы лічыце, што лячэнне малаэфектыўнае, то можаце папрасіць, каб вас накіравалі на кансультацыю туды. Трэба шукаць прычыны абвастрэння. Гэта могуць быць і стрэсы, і прадукты харчавання, і бытавая хімія або спалучэнне ўсіх фактараў.

Захворванне гэта хранічнае. Яно так і працякае: перыяд абвастрэння змяняецца перыядам рэмісіі. Колькі працягнецца рэмісія, залежыць ад таго, у якіх умовах чалавек знаходзіцца.

***☎— Наталля Мікалаеўна, Стоўбцы. Мне зараз 50 гадоў, маю праблему з вітыліга з 10 гадоў. Якія прычыны гэтай паталогіі? Ці ёсць метады лячэння, якой павінна быць прафілактыка?***

— Эфектыўнасць усіх методык лячэння складае не больш за 25%. Хвароба вывучана мала, таму гарантый у лячэнні ніхто не дасць.

Прафілактыка наступная. Калі ў маі пачынаецца актыўнае сонца, трэба пазбягаць інсаляцыі, карыстацца сонцаахоўнымі крэмамі, старацца пазбягаць стрэсаў і прытрымлівацца рэжыму дня.

У прынцыпе, пры вітыліга скура здаровая, толькі без пігменту. Як варыянт можна прымяняць спецыяльную касметыку, якая падбіраецца пад колер скуры і зафарбоўвае гэтыя светлыя плямы.

***☎— Мікалай Іванавіч, Нароўля. У мяне старая радзімка змяніла форму і колер, яна запалілася і лушчыцца. Гэта можа быць небяспечна?***

— Гэта не выключана. Калі радзімка мяняе форму і колер, запаляецца, то адразу трэба ісці да анколага і вырашаць, небяспечна гэта ці не.

***☎— Кацярына Рыгораўна, Гродна. У маёй унучкі знайшлі малюскі ў вобласці дэкальтэ. Ці можна ад гэтай паталогіі пазбавіцца? Малюскі з'яўляюцца зноў і зноў...***

— Можна, малюскі нядрэнна лечацца. Але толькі трэба пазбаўляцца ад усіх малюскаў адразу. Калі недзе хоць адзін застанецца, то будзе рэцыдыў. Трэба ўважліва агледзець дзіця і выдаліць усе малюскі адначасова, потым апрацаваць скуру кіслымі спіртамі.

***☎— Дзмітрый, Гомель. У мяне псарыяз. Скажыце, якія цяпер існуюць метады лячэння хваробы і ці можна зменшыць яе праявы?***

— Ніякіх асабліва новых змяненняў у лячэнні псарыязу не з'явілася. Праўда, ёсць новыя прэпараты, але кошт іх даволі высокі.

Тактыку лячэння ўрач выбірае, зыходзячы з таго, які гэта псарыяз: арганічны, распаўсюджаны, пашкоджана скура або валасістая частка галавы. Без агляду падказаць нейкі метад лячэння, што падыдзе менавіта вам, немагчыма. Трэба звяртацца да ўрача ў сваю паліклініку.

***☎— Валянціна, Барысаў. Зараз у аптэках ёсць мноства супрацьгрыбковых прэпаратаў. На ваш погляд, якія з іх самыя эфектыўныя?***

— Для кожнага віду грыбка трэба індывідуальна падбіраць прэпараты. І прызначыць іх павінен доктар, які праводзіць агляд і ведае, у якіх месцах ёсць грыбок. Калі ён на скуры, то гэта адзін прэпарат, калі на пазногцевых пласцінах — другі, на валасістай частцы галавы — трэці. А магчыма, спатрэбіцца спалучэнне розных прэпаратаў, вадкасцяў, а не толькі мазяў.

***☎— Галіна, Лагойск. Скажыце, ці можа вірус герпесу перадавацца ў спадчыну?***

— Герпес у спадчыну не перадаецца. Чалавек, сустрэўшыся некалі з вірусам герпесу, інфіцыруецца. І толькі. Проста клінічныя праявы ёсць у 5-15%. Таму, калі ў бацькоў былі гэтыя клінічныя праявы і ў іх ёсць збоі ў імуннай сістэме, то апошняя асаблівасць можа перадацца ў спадчыну.

***☎— Любоў Іванаўна, Мінск. Справа ў тым, што ў майго пляменніка псарыяз, а нядаўна яго бацькі папрасілі, каб ён нейкі час пажыў у нас дома. У гэтым выпадку давядзецца карыстацца агульнай ваннай, іншымі сродкамі гігіены. Ці не «падчэпяць» члены нашай сям'і балячку пляменніка? І ці варта нам прыняць нейкія прафілактычныя меры?***

— Псарыяз не заразны. Вы можаце спакойна жыць са сваім пляменнікам і прытрымлівацца звычайных правілаў гігіены.

***☎— Святлана Антонаўна, Лепель. Што вы параіце дзяўчыне, якая пакутуе ад прышчоў, што з'яўляюцца напярэдадні крытычных дзён?***

— Найперш варта звярнуцца па кансультацыю да гінеколага-эндакрынолага. Калі ўрач высветліць, што ніякай паталогіі з гэтага боку няма, то тады варта звяртацца да дэрматолага. Нельга параіць што-небудзь дакладнае, калі не бачыш канкрэтнага пацыента.

***☎— Нэла Іванаўна, Мазыр. У мяне на твары і на канечнасцях ёсць застарэлыя цёмныя бародаўкі. Як ад іх пазбавіцца?***

— Звярніцеся да касметолага. Ён агледзіць вас і вырашыць, якім чынам трэба пазбаўляцца ад гэтых застарэлых цёмных бародавак.

***☎— Таццяна, Івянец. У дачкі з 12 гадоў вугры. Зараз ёй — 15. Прышчы не праходзяць. Чым мы толькі не лячыліся, нічога не дапамагае. Як быць? Ці можна прыехаць да вас на кансультацыю?***

— Трэба звярнуцца да дэрматолага ў Мінскі абласны скурвендыспансэр. Калі лячэнне не дапаможа, можна папрасіць накіраванне ў кансультацыйны цэнтр у Мінск, які працуе на базе гарадскога скурвендыспансэра, тэл. для даведак: (8 017) 372 73 81.

***☎— Аксана Сяргееўна, Магілёў. Мне 70 гадоў. Пакутую ад вялікай колькасці папілом. Як спыніць іх рост і дзе можна гэта зрабіць на дзяржаўнай аснове?***

— Выдаленне папілом — працэдура платная. Гэта робяць у касметычных кабінетах, бо гэта касметычны дэфект, які не пагражае здароўю чалавека.

**«Прамую лінію» правялі Алена КРАВЕЦ і Вольга ШАЎКО.**

***(Працяг будзе.)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**ПРАГУЛКА З ВЕТРЫКАМ**

# ВЫВЕДЗЕНА ФОРМУЛА ІДЭАЛЬНАЙ ГАРБАТЫ

**Вучоныя з брытанскага Універсітэта Нартумбрыі склалі формулу ідэальнай гарбаты, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Вада павінна быць 100 °С, аптымальны час заварвання — 2 хвіліны, затым дадаецца ідэальная колькасць малака — 10 мл. Бездакорны напой, які мае тэмпературу 60 °С, атрымліваецца літаральна праз 6 хвілін пасля дабаўлення малака.

Вучоныя патлумачылі, што, калі мы п'ём гарбату, паднябенне патрабуе балансу паміж горыччу і салодкасцю. Даследаванне паказала, што 10 мл — гэта ідэальная колькасць малака на кубак гарбаты, якая ўраўнаважвае натуральную горыч напою і дазваляе згладзіць смакавыя адчуванні. Аптымальная тэмпература гарбаты ў 60 °С дасягаецца праз 6 хвілін пасля дабаўлення малака (чорная гарбата астывае да гэтай тэмпературы на дзве хвіліны марудней). Дабаўленне малака ў чорную гарбату ўзмацняе прысмак ірыскі і ванілі і аслабляе драўняныя і травяныя ноткі, а шасціхвілiннае чаканне дапамагае пазбегнуць рызыкі апячыся, але дазваляе атрымаць асалоду ад смаку і водару напою.

Каб вывесці гэтую формулу, даследчыкі ў лабараторыі тэставалі розныя спосабы заварвання гарбаты, а 285 добраахвотнікаў спрабавалі прыгатаваны напой.

Эксперымент увогуле заняў 180 гадзін.

**Кар. БЕЛТА.**

## Доктар адкажа

# Маззю варыкоз не вылечыш

**«У нас варыкоз. «Зорачкі» раней былі толькі на галёнцы, а цяпер узнімаюцца вышэй. Як затрымаць варыкоз? Мазь траксевазін не дапамагае...**

**Іванова М.Н. і Рыбакова Т.Н.,** *г. Віцебск».*

**Дацэнт кафедры Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Ігнат ДАВІДОЎСКІ:**

— У першую чаргу неабходна было б звярнуцца ў Віцебскі дыягнастычны цэнтр да сасудзістага хірурга, які ацэніць сітуацыю і паставіць дыягназ варыкознага пашырэння вен. У шэрагу выпадкаў «зорачкі», або «павучыныя лапкі», могуць азначаць не хваробу, а толькі касметычны дэфект. Аднак бывае, што зорачкі сапраўды з'яўляюцца папярэднікамі варыкозу.

Да таго, як вы наведаеце спецыяліста, можна ўзяць на заметку наступную інфармацыю. Звычайна людзям з устаноўленым дыягназам варыкознага расшырэння вен, дрэннай работай венозных клапанаў прызначаюць правільны выбар адзення. Доўгачасовую палёгку прыносіць нашэнне эластычных панчох або гольфаў (калі варыкоз ахапіў толькі ніжнюю частку ног). Іх таксама прызначаюць па паказаннях падчас цяжарнасці. Шчыльнасць такіх панчох вымяраецца не ў звыклых «дэнах», а ў мм рт. сл. Такія панчохі перашкаджаюць адваротнаму току крыві ў расшыраныя сасуды, што дазваляе лепш забяспечваць кроўю мышцы ног. Супрацьварыкозныя панчохі прадаюцца ў аптэках і магазінах медыцынскіх тавараў. Апранаць іх трэба раніцай, яшчэ не ўстаўшы з ложка. Насіць неабходна цэлы дзень. Пры гэтым панчохі не павінны празмерна сціскаць сцёгны і галёнкі.

Варыкоз праяўляецца расшыранымі, набухлымі венамі, якія выпіраюць пад скурай. На больш познім этапе развіцця хваробы скура каля галёнкаступнёвага сустава становіцца карычнявата-шэрай, на шчыкалатках з'яўляюцца язвы. Варыкозна змененай можа стаць любая вена, але часцей за ўсё хвароба ахоплівае вены ног.

Варта пазбягаць працяглага сядзення або стаяння. Часцей уставайце і хадзіце. У канцы дня для палёгкі стану ўзнімайце ногі на 30 см над узроўнем сэрца, што пазбаўляе ацёку і свербу. Карысныя рэгулярныя фізічныя практыкаванні. Хада, язда на веласіпедзе і плаванне зніжаюць ціск у венах.

Цэлы шэраг так званых мазяў для ног, у тым ліку траксевазін, не лечаць захворванне, а толькі забяспечваюць часовую палёгку — знімаюць на нейкі час непрыемныя адчуванні. Для прадухілення хуткага прагрэсавання хваробы сасудзісты хірург рэкамендуе хірургічнае лячэнне — напрыклад, склератэрапію. У дробныя і сярэднія варыкозна расшыраныя вены ўводзіцца раствор, які выклікае склеразаванне, звужэнне прасвету вены, што накіроўвае кравато к у больш здаровыя вены. Для пазбаўлення сасудзістых зорачак і лячэння дробных варыкозных вен прымяняецца лазерная тэрапія.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

У сувязі з заявай, якая паступіла ў суд Ляхавіцкага раёна, аб прызнанні **Карабан Варвары Герасімаўны**, 1 жніўня 1948 года нараджэння, ураджэнкі в. Весніно Лагойскага раёна Мінскай вобл., апошняе вядомае месца жыхарства в. Сёмкава Лагойскага раёна Мінскай вобл., адсутнай без вестак, просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Карабан Варвару Герасімаўну, паведаміць суду Ляхавіцкага раёна на адрас: Брэсцкая вобл., г. Ляхавічы, вул. Першамайская, д. 6 на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.



## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Аукцион состоится 26 июля 2011 года в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений **– 20.07.2011** года до 17.00.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**; б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения.

**Победитель аукциона обязан:** в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 8 миллионов рублей. **Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | переулок 1-й Сараканайский, 7 (ограничения – р. Дубровенка) | 0,0932 | 740100000001004765 | 448 544 | 30 766 000 | 2 769 000 |
| № 2 | в районе улицы Слепокурова № 12 по генплану | 0,1200 | 740100000001004850 | 454 596 | 29 905 000 | 2 691 000 |
| № 3 | в районе улицы Слепокурова № 14 по генплану | 0,1200 | 740100000001004852 | 445 111 | 29 905 000 | 2 691 000 |
| № 4 | в районе улицы Слепокурова № 15 по генплану | 0,1200 | 740100000001004853 | 445 111 | 29 905 000 | 2 691 000 |
| № 5 | в районе улицы Слепокурова № 16 по генплану | 0,1200 | 740100000001004854 | 445 111 | 29 905 000 | 2 691 000 |
| № 6 | в районе улицы Слепокурова № 17 по генплану | 0,1200 | 740100000001004855 | 445 111 | 29 905 000 | 2 691 000 |
| № 7 | в районе улицы Слепокурова № 18 по генплану | 0,1200 | 740100000001004857 | 448 601 | 29 905 000 | 2 691 000 |
| № 8 | в районе улицы Слепокурова № 19 по генплану | 0,1200 | 740100000001004856 | 445 111 | 29 905 000 | 2 691 000 |

## МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

**Аукцион состоится 26 июля 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Срок аренды | Цель использования, условия продажи | Кадастровый номер | Стоимость землеустроительного дела (руб.) | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| № 1 | улица Габровская | 0,2697 | 50 лет | строительство и обслуживание административно-складской базы | 740100000005003822 | 532 579 | 105 099 000 | 9 459 000 |
| № 2 | переулок Гаражный | 0,6116 | 50 лет | строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей с автомойкой и магазином сопутствующих товаров | 740100000003005963 | 1 434 695 | 862 618 000 | 77 636 000 |
| № 3 | район пересечения Минского шоссе и улицы Пелагеевской (ограничения – р. Дубровенка) | 0,2500 | 50 лет | строительство и обслуживание гостиницы и кафе | 740100000001005247 | 583 397 | 223 141 000 | 20 083 000 |
| № 4 | улица Ямницкая (ограничения – охр. зона ЛЭП) | 0,0800 | 50 лет | строительство и обслуживание складских помещений | 740100000003005397 | 1 478 015 | 38 232 000 | 3 441 000 |
| № 5 | улица Янтарная в районе ост. «Улица Маневича» (пос. М.Боровка) (ограничения – ЛЭП, катодная защита) | 0,0647 | 50 лет | строительство и обслуживание магазина смешанной группы товаров с производственным цехом, с условием выноса с пятна застройки ЛЭП | 740100000007004947 | 1 181 165 | 42 739 000 | 3 847 000 |
| № 6 | улица Симонова, остановка «Торговый дом «Броды» | 0,0014 | 1 год | установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне | 740100000005004309 | – | 195 000 | 18 000 |
| № 7 | улица Симонова, остановка «Торговый дом «Броды» | 0,0016 | 1 год | установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне | 740100000005004310 | – | 222 000 | 20 000 |
| № 8 | улица Симонова, остановка «Поликлиника № 8» (от центра) | 0,0017 | 1 год | установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне | 740100000005004311 | – | 236 000 | 21 000 |
| № 9 | улица Симонова, остановка «Поликлиника № 8» (от центра) | 0,0018 | 1 год | установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне | 740100000005004313 | – | 250 000 | 23 000 |
| № 10 | улица Ярославская в районе жилого дома № 7 | 0,0047 | 1 год | размещение объекта розничной торговли | 740100000007004796 | – | 498 000 | 45 000 |
| № 11 | район пересечения улиц Тенистой и Кленовой | 0,0091 | 2 года | установка и обслуживание павильона по продаже продовольственных товаров | 740100000007004588 | 522 632 | 826 000 | 74 000 |

**Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.**

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

**Юридические лица**: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Индивидуальные предприниматели**: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

**Граждане** – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

**Иностранные юридические лица**: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

**Представители иностранного юридического лица или гражданина:** легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане и субъекты хозяйствования, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры – земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации, земельные участки для нового строительства – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

4) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 9 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 20.07.2011 года до 17.00**.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.**



## КАРЭСПАНДЭНТ «ЗВЯЗДЫ» ПАБЫВАЎ ЗА КУЛІСАМІ «ПЕСНІ ГОДА-2011»

Шоу-бізнэс

# ДЗЯЎЧАТЫ З «ТОПЛЕС» ЗБІРАЮЦЦА ПАГАЛІЦЬ ГАЛОВЫ, А СПЯВАЧКА АЎРА ПАСЛЯ КАНЦЭРТА НІ З КІМ НЕ РАЗМАЎЛЯЕ

**Хто з беларускай эстрады пераймае стыль Лэдзі ГАГА? Ці ходзяць салісткі «Топлес» аголенымі па вуліцы і чаму спявачка Аўра маўчыць пасля сваіх канцэртаў? Пра гэта і не толькі артысты па сакрэту расказалі карэспандэнту «Звязды». 25 чэрвеня ў вячаровым эфіры тэлеканала «АНТ» пакажуць відэаверсію «Песні года-2011». Здымкі канцэрта прайшлі напярэдадні ля сцен Мірскага замка ў межах праекта «Музычныя вечары ў Мірскім замку».**

За кулісамі «Песні года» — рабочая атмасфера, шмат зорных твараў і... нават можна папіць дармавой гарбаты. Здымкі праходзяць пад адкрытым небам, таму замест грымёрак — вялікія плашч-палаткі. «Пакояў» у іх толькі чатыры, і кожны з іх разлічаны адразу на семярых, а то і дзесяцярых артыстаў. Дзяўчаты — налева, хлопцы — направа. Але да такіх «спартанскіх» умоў, як відаць па ўсмешлівых тварах «зорак», ім не прывыкаць.

### Хто капіруе Лэдзі Гага?



Артыстаў заяўлена пад 50 чалавек. Над палаткай вісіць спіс — хто за кім выступае. Адтуль можна даведацца, што скончыць канцэрт маладая спявачка Насця Віннікава, а адкрые музычны марафон **Юля Быкава, вядомая як праект «Аўра»**.

Вунь яна, дарэчы ўжо і стаіць. Рыхтуецца да выхаду. У яе чорныя туфлі на вялікіх (20 см) абцасах і чорная сукенка. На галаве адмысловы капялюш.

— Я думаю, усе дзяўчаты невялікага росту мяне зразумеюць, — каментуе высокія абцасы спявачка. — Ды ў туфлях мне вельмі зручна.

***— Вы не адчуваеце сябе маленькай Лэдзі Гага беларускай сцэны?***

— Ой, не кажыце мне пра гэта *(смяецца. —* **Аўт.***)*! Шчыра вам кажу: я люблю гэту выканаўцу, але пераймаць у яе што-небудзь не хачу. У мяне проста ўбор такі атрымаўся.

Як прызналася спявачка, фаніятр рэкамендуе ёй пасля канцэртаў маўчаць, таму што «пасля сольнага канцэрта трэба берагчы звязкі» і «нельга два дні запар шпарыць канцэрты». Сама спявачка з гэтым згодная: «Ведаеце, ёсць звязкі, якія вытрымліваюць, а ёсць такія, да якіх патрэбен асаблівы падыход, неабходна ставіцца да іх беражліва». Вось артыстка пасля канцэрта і маўчыць.

А вось іншая яе калега па цэху — рудавалосая **Ева** — пасля выступлення актыўна налягае на гарбату, грэецца. У Евы цікавая сукенка — шыпы на левым плячы і адмысловы макіяж. Калі ўзгадаць амерыканскую поп-сцэну, атрымаецца іншы, чым у Аўры, але не менш чарговы вобраз Лэдзі Гага.



— А мне заўсёды падабаліся арыгінальныя ўборы, — лупіць праўду-матку спявачка. — Проста я не настолькі мяккая натура, як большасць нашых артыстак, якія выступаюць у нейкіх пяшчотных сукенках. Мяне цягне на эксперыменты.

Паводле слоў спявачкі, яе эксперыменты датычаць не толькі адзення, але і музыкі. На яе думку, у беларускай музычнай індустрыі «ёсць адмысловы фармат, які дыктуе астатнім умовы гульні. У той жа Еўропе аднолькава развіваецца і рок, і панк, і іншыя накірункі». І каб з'явілася здаровая канкурэнцыя, «трэба развіваць і іншыя накірункі. Не толькі поп-музыку. Якраз тады і з'явіцца здаровая канкурэнцыя, якая проста неабходная музычнай індустрыі».

### Як Лейла Ісмаілава і Насця Віннікава скарылі рускіх мужчын



Вядучая **Лейла Ісмаілава** (будзе весці канцэрт Аляксандра Іванова з гурта «Ронда») і спявачка **Настасся Віннікава**, якія толькі нядаўна вярнуліся са здымак праекта «Бітва тытанаў» у Францыі, поўныя творчых планаў і энергіі. Дзяўчаты вельмі пасябравалі і сталі нават у нечым падобныя.

Карэспандэнту «Звязды» яны наперабой расказвалі пра Францыю і свае ўражанні ад здымак. Прызналіся, што нават калі Расія абыходзіла беларусаў у спаборніцтвах, то ўсе рускія хлопцы былі зачараваны прыгажосцю беларусак.

Здзівіла дзяўчат прастасць знакамітых расіян: «Паколькі мы абедзве гаваркія, нам было вельмі цікава знаёміцца і кантактаваць з імі. Насамрэч, яны вельмі простыя ў стасунках. Такія ж людзі, як і ўсе. Як правіла, чым больш чалавек дабіваецца ў жыцці — тым прасцей ён сам і тым прасцей трымаецца. І што самае цікавае, на гэтым конкурсе ўсе былі апрануты ў аднолькавую форму, не было «крутых» тэлефонаў, брэндаў у адзенні, целаахоўнікаў — усе былі роўнымі».

Лейла з гумарам узгадала, як аднойчы да яе падышоў алімпійскі чэмпіён па дзюдо з Расіі і папрасіў гумку, а яна нават не ведала, з кім размаўляе. Насця Віннікава расказала, як здавала адзін з экзаменаў ва ўніверсітэце: артыстка ўжо як паўгода «прабадзялася» на здымках, прапускаючы заняткі. Але не дарма: шмат часу Насця надавала самападрыхтоўцы, таму экзамены здала без праблем.

### Лысыя «Топлес» — новая фішка беларускага шоу-бізнэсу?

Дзяўчаты з «Топлес», якіх нядаўна пабольшала на адну салістку і якія выступаюць ужо як квартэт, прызналіся, што даўно выношваюць ідэю... пагаліць галовы. Толькі ўявіце — першы ЛЫСЫ дзявочы гурт! Навошта?

— А што вы думаеце, калі мы вас яшчэ здзівім, — інтрыгуюць, смеючыся, дзяўчаты. — Мы любім эксперыменты, таму калі што — не здзіўляйцеся.

***— А вас прадзюсар не прымушае хадзіць топлес, як штраф за правіннасці?***

— Мы звычайна па Мінску так і ходзім, — жартуюць дзяўчаты. — Па вечарах каля вашай рэдакцыі. Там нядаўна эксгібіцыяніста затрымалі. Дык вось — гэта была адна з нас...

Астатнія субяседнікі, якія трапляліся карэспандэнту «Звязды», жартавалі менш. **Ніна Багдавана** ўзгадала свае гастрольныя прыгоды ў Кушадасах, калі давялося правозіць праз мяжу няпоўнагадовую ўдзельніцу з танцавальнай групы. А юная Ксенія Сітнік на чысцюткай беларускай мове сказала, што лічыць Мірскі замак «вялікім скарбам нашай краіны» і што канцэрт павінен атрымацца — «вельмі добрая тут атмасфера — повязь гісторыі і сучаснасць суіснуюць разам».

### «Ёсць толькі творчасць»

— Песня года — вельмі важнае мерапрыемства для ўсіх, — прызнаецца **Алена Грышанава**. — Новыя выканаўцы маюць магчымасць заявіць пра сябе, заявіць пра свае поспехі. Я заўсёды рада прымаць удзел у такіх праектах. Тэлеканал АНТ заўсёды гэта робіць вельмі ярка, па-мастацку прыгожа. І вельмі запамінальна.

Маладыя артысткі **Анастасія Шык** і **Алёна Гарбачова**, якія запомніліся гледачу бэк-вакалам у нумары Настассі Віннікавай на «Еўрабачанні», падзяліліся са «Звяздой» сваімі ўражаннямі пра сам конкурс:

— Узровень еўрапейскай музыкі трошкі вышэйшы — і нам свой падымаць таксама трэба, — гавораць дзяўчаты. — З'яўляюцца новыя імёны, гэта магчымасць хлопцаў і дзяўчат, якія пачынаюць паказваць сябе — у нас шмат таленавітай моладзі. На «Еўрабачанні» людзі не гублялі ні хвіліны — спявалі і гралі — творчая атмасфера вельмі зараджала энергіяй. Усе настолькі былі з'яднаныя, што было не важна: артыст ты, бэк-вакаліст ці харэограф. Ёсць толькі музыка — няма рэгалій, толькі творчасць.

Як расказала па сакрэце «Звяздзе» **дырэктар дырэкцыі спецпраектаў тэлеканала АНТ Анжаліна Мікульская**, налета, калі АНТ будзе святкаваць 10 гадоў з моманту ўтварэння, свой юбілей тэлеканал плануе адзначыць таксама тут — ля сцен Мірскага замка. І па прызнанні Анжаліны, гледачоў будзе чым здзівіць. Інтрыгу яна не адкрыла, але дала зразумець, што планы — напалеонаўскія.

**Ілья ЛАПАТО. Фота Дзмітрыя РУДЭНКІ.**



Вядучыя «Песні года» Дзмітрый Шунін і Дарыя.

# «Заваяваць давер абітурыентаў было няпроста...»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Мы неаднойчы запрашалі журналістаў да нас у інстытут, каб прадэманстраваць усе меры, якія прымаюцца для захавання канфідэнцыяльнасці інфармацыі, — падкрэсліў Мікалай Фяськоў. — У Расіі апаненты адзінага дзяржаўнага экзамену крытыкуюць яго дрэнную арганізацыю і сцвярджаюць, што АДЭ не толькі не вырашае праблему карупцыі, а, наадварот, стварае для яе глебу. Адным словам, заваяваць давер абітурыентаў у Расіі не ўдалося. Спадзяюся, што ў Беларусі ніхто не стане праводзіць паралелі паміж Адзіным дзяржаўным экзаменам у Расіі і нашым цэнтралізаваным тэсціраваннем. Банк заданняў ЦТ змяшчаецца ў ноўтбуку, які захоўваецца ў сейфе і недаступны для хакерскіх атак. Доступ да ноўтбука мае толькі адзін чалавек, і ён сам сабе не вораг.

У тым жа памяшканні, дзе захоўваецца сейф з банкам тэставых заданняў, адбываецца і кампаноўка 10 варыянтаў будучых тэстаў. Ва ўпраўленні па распрацоўцы і сертыфікацыі тэстаў створана спецыяльная камп'ютарная праграма — кадыфікатар. Кожнаму заданню прысвойваецца свой код. Метадыст складае план будучага тэста згодна са спецыфікацыяй, і запускаецца камп'ютарная праграма, якая метадам сляпога выбару самастойна фарміруе сотні варыянтаў.

Пры кампанаванні будучых тэстаў «прэтэндэнтаў» на кожнае заданне не менш за 100. А канчатковыя 10 варыянтаў для тэсціравання з мноства толькі што сфарміраваных адбіраюцца на вачах у старшыні або члена Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў. Такім чынам, дамовіцца паміж сабой раней немагчыма. Ні члены аўтарскіх калектываў, ні работнікі інстытута не могуць ведаць змест будучых тэстаў.

Калі ў еўрапейскіх краінах тыражаваннем матэрыялаў тэсціравання займаюцца або аддзелы лагістыкі, або асобныя службы, то ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў і тыражаваннем, і пакетаваннем матэрыялаў ЦТ займаецца толькі метадыст па гэтым прадмеце. Такім чынам узмацняецца інфармацыйная бяспека. Пад размнажэнне тэставых матэрыялаў у інстытуце адведзены асобныя пакоі з відэаназіраннем, у якіх знаходзяцца рызографы і спецыяльны апарат — лістападборачная машына, які дазваляе ў аўтаматычным рэжыме раскласці размножаныя матэрыялы па дзесяці варыянтах, прычым ён ніколі не памыляецца. Для дастаўкі тэстаў ва ўсе аўдыторыі, дзе праходзіць тэсціраванне, рыхтуюцца спецыяльныя пакеты з сакрэтнай стужкай, якія проста немагчыма ўскрыць непрыкметна. Як толькі цэласнасць стужкі парушаецца, на ёй праступаюць схаваныя ад вачэй сімвалы. На кожным пакеце ёсць ярлычок, дзе нанесены нумар і штрых-код, што дазваляе ідэнтыфікаваць пакеты пры іх вяртанні з пунктаў тэсціравання ў інстытут. Бланкі адказаў выпрацоўваюцца на фабрыцы Дзяржзнака, маюць ступені аховы такія, як на грашовых знаках, і з'яўляюцца дакументамі строгай справаздачнасці, таму поўнасцю выключаецца магчымасць іх фальсіфікацыі. На кожную аўдыторыю запаўняецца акт, у якім пазначана не толькі колькасць бланкаў, але і іх нумары, таму чужыя бланкі апынуцца ў пакеце не могуць. Да таго ж арганізатары ЦТ сваім подпісам пацвярджаюць, што менавіта гэты бланк знаходзіўся ў экзаменацыйнай аўдыторыі. Наступны этап — дастаўка тэставых матэрыялаў у пункты правядзення ЦТ. Гэтая задача ўскладзена на дзяржаўную фельд'егерскую службу, якой давяраюць дыпламатычную перапіску і дзяржаўныя сакрэты. **Матэрыялы ЦТ — гэта таксама сакрэт дзяржаўнага значэння.** Вайскоўцы атрымліваюць апламбаваную валізу (іх фарміраванне ажыццяўляецца спецыяльнай камісіяй, у якую абавязкова ўваходзіць метадыст), на ёй пазначаны адрасат і прозвішча чалавека, якому яна павінна быць уручана. Гэта, як правіла, старшыня арганізацыйнай камісіі па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання пэўнай навучальнай установы ці яго намеснік.

«І ўсё ж такі, няўжо ні ў каго з абітурыентаў не ўзнікала жадання знайсці ў ЦТ хоць бы нейкі пралаз?» — цікавімся ў Мікалая Фяськова.

— Вядома, такія спробы былі, — усміхнуўся наш субяседнік. — Напрыклад, быў выпадак, калі разам з дачкой спрабавалі прайсці здаць ЦТ па гісторыі Беларусі яе бацькі-настаўнікі, але арганізатары праявілі сваю пільнасць. Сёння ў нас выкарыстоўваецца такая сістэма размяшчэння абітурыентаў, калі ў адной экзаменацыйнай аўдыторыі не могуць знаходзіцца разам сваякі ці аднакласнікі. Да таго ж варыянтаў прапануецца дзесяць, а не два—тры, як у многіх еўрапейскіх краінах, таму ніхто з «суседзяў» дапамагчы не зможа. Амаль кожны год здараюцца выпадкі, калі за аднаго чалавека спрабуе прайсці на экзамен іншы. Так, летась у філіяле БДЭУ на тэсціраванні па англійскай мове арганізатары ўстанавілі, што за абітурыентку здае экзамен студэнтка другога курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Цікава, што адна з дзяўчат была бландзінкай, а ў другой былі цёмныя валасы. На што яны спадзяваліся? Колькі год таму ў прыёмнай камісіі ВНУ была выяўлена падробка сертыфіката ЦТ — дакладней, у ім былі падпраўлены балы. Мы тут жа прабілі па сваёй базе і ўстанавілі, колькі балаў насамрэч набраў гэты абітурыент. Між іншым, Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт першым узяў за правіла правяраць сапраўднасць сертыфікатаў сваіх першакурснікаў. Штогод дзяржаўная камісія правярае залічаных на навучанне студэнтаў па асобных ВНУ. Але абсалютна ўсе ВНУ могуць праверыць у нас сапраўднасць прад'яўленых у прыёмныя камісіі сертыфікатаў. І хоць больш ніводнага разу спроб фальсіфікацыі дакументаў устаноўлена не было, мы гатовы развеяць любыя сумненні. Прызнаюся, што заваяваць давер да ЦТ з боку абітурыентаў, іх бацькоў, педагагічнай грамадскасці было вельмі няпроста. Таму мы вельмі даражым створанай намі сістэмай...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# КАЛІ НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ЎЖО НЕ ПЕРАДАЮЦЦА ПРАЗ БАЦЬКОЎ, ТО ІХ МОЖНА АДРАДЖАЦЬ... ПРАЗ ДЗЯЦЕЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Тым больш што ёсць пэўныя напрацоўкі, якія варта было б пераймаць усім школам. Ірына Калачова ўзгадвае пра этнашколы, ідэю развіцця якіх пачаў прасоўваць у 90-я гады Ілья Сучкоў. У аснову была пакладзена народная педагогіка і мастацкія традыцыі выхавання беларусаў. Ірына Іванаўна ўпэўнена, што гэта быў навуковы прарыў, глыбіннае пранікненне ў разуменне, як трэба захоўваць нашу нацыянальную культуру.

### Гора ад розуму

Адна з сучасных тэндэнцый, падмечаная Ірынай Калачовай, — заклапочанасць сучасных бацькоў такім аспектам у развіцці дзяцей, як атрыманне ведаў. Гэта не пярэчыць традыцыям. Раней казалі: «Хто дзіця мае — няхай навучае», «Умеў дзіця радзіць — умей і вывучыць». І нягледзячы на тое, што беларусы ўслаўлялі працу і чалавек вымушаны быў шмат фізічна працаваць, вучэнне продкі цанілі, яно ўспрымалася як «святло ў канцы тунэля». Людзі разумелі, што трэба шукаць дзецям больш лёгкую долю.

І вось сучасныя бацькі, як кажуць, «дарваліся». З самага юнага ўзросту дзяцей цягаюць па розных школах развіцця і гуртках. Ці добра гэта?

Асабіста я ўсё часцей лаўлю сябе на думцы, што не хачу гэта прымаць. І тым не менш, я ўжо чатырохгадовае дзіця рыхтую да школы, сяджу з ім над літаркамі і лічбамі (а не чытаю казкі), у выхадныя цягну ў школу ранняга развіцця (а не іду, напрыклад, у парк). І не таму, што я хачу расціць з дзіцяці вундэркінда. Я вымушана гэта рабіць, бо сёння дзіця павінна навучыцца чытаць і лічыць яшчэ да школы. Хоць мае равеснікі ды і я сама ўсё гэта спасцігалі ў першым класе ў сямігадовым узросце. І хіба мы з-за таго выраслі неадукаванымі?

Ці павінна так быць, цікаўлюся ў Ірыны Іванаўны.

— Маё пакаленне з гэтым сутыкнулася яшчэ 15 гадоў таму. Ужо тады ў нас з'явілася заклапочанасць аб тым, якімі павінны вырасці дзеці. Я сама куды толькі не вадзіла дзяцей, чым не займала... Праграма развіццёвага навучання была ў нашай гімназіі... Вынік таму ёсць, і неблагі. Але... Сёння кіраўнікі падобных гімназій заўважаюць, што гэта было і шкодным для многіх дзяцей. Так, дзеці выраслі разумныя, але многія — сацыяльна неадаптаваныя. Шмат хто не ўладкаваны ў прыватным жыцці, таму што не можа знайсці сабе дастойную пару. Некаторыя з такіх дзяцей, жадаючы рэалізавацца, з'язджаюць з Беларусі. І гэта страта і для сям'і, і для краіны. Акрамя таго, такое гіпербалізаванае стаўленне да адукацыі дзяцей параджае боязь нараджаць яшчэ. Людзі думаюць аб тым, што яны тады змогуць даць сваім сынам і дочкам, ці хопіць у іх грошай на адукацыю.

Загружанасць дзяцей можа ў будучыні сказацца напружанасцю ва ўзаемаразуменні з бацькамі. Мы так занятыя адукацыяй дзяцей, што нам і пагаварыць з імі няма калі.

### Вярнуць сям'і тату

— Раней бацька займаў моцную пазіцыю ў сям'і. Яго моц была ў вяршэнстве, у яго быў аўтарытэт, яго голас быў рашучым. Неабходна вярнуць бацьку ў сям'ю, — упэўнена Ірына Калачова. А для гэтага не трэба казаць, што ён здабытчык. Глядзіце, якая розніца ў працягласці жыцця мужчын і жанчын, — 12-14 гадоў. Выстаўляючы мужчыну на сцежку вайны, здабывання, мы ставім яго ў невыносныя ўмовы. Ён не можа з гэтым справіцца. Я была на канферэнцыі ў Маскве па цікавай праблематыцы «Гендар, сям'я і ўлада». Дайшло, што даводзіцца даказваць, што такое сям'я. Створана сусветная супольнасць навукоўцаў (зараз у ёй аб'яднаны прадстаўнікі 64 краін), каб сказаць свету, што сям'ёй з'яўляецца толькі спалучэнне «мужчына і жанчына»! Асобныя праявы крызісу ў сям'і мы таксама назіраем. Усё большай папулярнасцю карыстаюцца грамадзянскія шлюбы. Чаму моладзь за гэта хапаецца? А што такое ўстаноўка — здабытчык? Гэта патрэба праявіць сілу волі, гэта адказнасць. Сёння многія мужчыны не хочуць быць валявымі і накачанымі, яны не хочуць «паляваць на маманта». Адсюль і тэндэнцыя, што хлопцы не жадаюць жаніцца.

Сёння трэба думаць аб тым, як даць маладым людзям устаноўку, каб у іх была поўная сям'я, каб нараджалі дзяцей. Раней гэта не трэба было закладаць у розумы — усё адбывалася само па сабе, па традыцыі.

— Ці магчыма гэтаму спрыяць адміністрацыйнымі сродкамі?

— Трэба падымаць грамадскі статус сям'і, сямейнага чалавека. Мы яшчэ цэнім дух публічнасці, грамадскай думкі. У нашых продкаў каштоўнасць сям'і, яе аўтарытэт была ў колькасці. Ні аднадзетная, ні няпоўная сям'я, у якой маці-адзіночка, не цанілася. Вага чалавека ў грамадстве была тым вышэйшая, чым больш моцную і вялікую сям'ю ён меў. Не думаю, ці трэба гэта вяртаць адміністрацыйнымі шляхамі. Я вывучала вопыт Францыі. Там на пасаду чыноўніка не бралі чалавека, калі ў яго не было мінімум трох дзяцей. Падобныя стымуляванні для нараджэння дзяцей былі і за савецкім часам. Сёння не сорамна быць у разводзе, расціць дзіця паза шлюбам, быць халасцяком да 30-40 гадоў. Гэта ўсё тое, што не было б прынята нашымі продкамі.

### Сродкі ад адзіноты

Раней грамада асуджала моладзь, якая да пэўнага ўзросту не абзаводзілася сям'ёй. Чаго толькі вартае цяганне калодкі халастымі хлопцамі? Але ў той жа час жыццё было насычана рознымі святамі і гульнямі, на якіх моладзь атрымлівала магчымасць прыглядзецца, пазнаёміцца. А куды ёй дзявацца сёння, дзе шукаць сваю палову, калі ты ўжо перарос узрост студэнцкіх дыскатэк?

— Я нарадзілася ў невялікім гарадку, і ўся мая маладосць прайшла ў клубе. Там заўсёды былі людзі. Гэта была вельмі моцная структура, якая аб'ядноўвала прадстаўнікоў розных узростаў для рэалізацыі патрэбы ў стасунках, — заўважае Ірына Калачова. — Не ведаю, што сучасныя клубныя ўстановы робяць. Калі б я ні прыехала на малую радзіму, бачу, што клуб зачынены. А дзе моладзі дзявацца? Куды ісці? Дзе знаёміцца? А ў дадатак, калі клубы і існуюць, напрыклад, пры ўніверсітэтах, моладзь трэба туды цягнуць. Куды знікаюць спецыялісты па арганізацыі масавых свят, якіх у вялікай колькасці рыхтуюць нашы ўстановы культуры? Напрыклад, ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў заўсёды вялікія конкурсы. Складваецца ўражанне, што моладзь сюды, як і ў іншыя ВНУ, проста ідзе па дыпломы.

Вышэйшая адукацыя не павінна быць масавай, бо так ідзе падрыхтоўка кадраў у нікуды. Спецыяліста неабходна не проста вырошчваць, але і суправаджаць пасля заканчэння ВНУ.

І вось які парадокс: сёння назіраецца запатрабаванасць культурнага прадукту, навукоўцамі сабраны багатыя этнаграфічныя матэрыялы, напісана шмат розных прац, але гэта не рэалізуецца на практыцы. Ёсць установы, якія рыхтуюць для такой місіі спецыялістаў, а ўзнімаць культурны пласт няма каму... І тым не менш, хочацца верыць, што з цягам часу ўсё зменіцца. Беларусь, гэтак жа, як і любы іншы народ, можа быць моцнай сваёй самабытнасцю, сваёй адметнасцю, сваімі традыцыямі. Разуменне гэтага ўжо ёсць, засталося толькі дачакацца ініцыятывы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА**

извещает о проведении аукциона с применением метода понижения начальной цены по продаже имущества республиканской собственности – 16 автотранспортных средств.

**Аукцион состоится 28 июля 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35 (актовый зал).**

Продавец: Автотранспортное государственное учреждение «Белтрансспецавто» Управления делами Президента Республики Беларусь; 220004, г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35, конт. тел. 200 28 23, 226 46 78.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества; 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, конт. тел. 200 20 89.

На аукцион выставляются легковые автомобили, находящиеся на территории Продавца по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35:

| № лота | Полное наименование транспортных средств | Год выпуска | Инвентарный номер | Характеристики объектов республиканской собственности: номер кузова (шасси), цвет | пробег, тыс. км | объем двигателя, литров | краткое описание технического состояния | Начальная цена, рублей | Минимальная цена, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ГАЗ -31022 | 1995 | 5226 | S0003270, белый | 317,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, основные узлы и агрегаты требует кап. ремонта, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, боковое зеркало заднего вида (левое), коммутатор, патрубки системы охлаждения, боковой повторитель поворота (правый), панель предохранителей | 3 725 526 | 745 105 |
| 2 | ГАЗ -31022 | 1995 | 5219 | S0003168, серо-белый | 363,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, колпаки колес, патрубки системы охлаждения | 2 335 404 | 467 081 |
| 3 | ГАЗ -31029 | 1996 | 3170 | T0492430, светло-серый | 223,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, колпаки колес, патрубки системы охлаждения, рукоятка рычага КПП, магнитола, подголовники задних сидений | 3 330 292 | 666 058 |
| 4 | ГАЗ -3110 | 1997 | 3418 | V0009729, темно-коричневый | 147,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, рычаги стеклоочистителя, коврики, магнитола, рукоятка рычага КПП | 3 720 325 | 744 065 |
| 5 | ГАЗ -3110 | 1998 | 3383 | XTH311000W0157010, серо-белый | 214,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, магнитола, 3 колпака колес | 2 740 240 | 548 048 |
| 6 | ГАЗ -3110 | 2000 | 3517 | 311000Y0361598, белый | 209,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, деформирован капот, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, коврики, боковые зеркала заднего вида, магнитола, прикуриватель, ручка стеклоподъемника передней левой двери, 3 колпака колес | 4 515 595 | 903 119 |
| 7 | ГАЗ -3110 | 2001 | 3610 | 31100010441304, белый | 175,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, коврики, боковое зеркало заднего вида (правое), панель магнитолы, колпаки колес, рукоятка рычага КПП | 4 978 036 | 995 607 |
| 8 | ГАЗ -3110 | 2001 | 3572 | 31100010414464, белый | 194,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, пробка расширительного бачка, фонарь освещения салона, рукоятка рычага КПП, переключатель поворота | 5 124 449 | 1 024 890 |
| 9 | ГАЗ -3110 | 2001 | 3609 | 31100010440774, белый | 236,0 | 2,3 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, задняя панель под регистрационный знак, боковые повторители поворотов, передний бампер, противотуманные фары, магнитола, рукоятка рычага КПП, 2 колпака колес | 4 904 830 | 980 966 |
| 10 | ГАЗ -3102 00 | 1996 | 3095 | T0049141, светло-серый | 292,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, антенна радио, боковое зеркало заднего вида (левое), фонарь подсветки заднего регистрационного знака, рукоятка рычага КПП, колпак колеса | 3 243 084 | 648 617 |
| 11 | ГАЗ -3102 00 | 1996 | 3133 | XTH310200T0053147, светло-серый | 275,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, подголовники передних сидений, рукоятка рычага КПП, трос капота и ручка его открытия, колпаки колес | 3 291 487 | 658 297 |
| 12 | ГАЗ -3102 00 | 1996 | 3172 | T0058096, светло-серый | 294,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес, неисправен замок зажигания; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, боковые повторители поворотов, колпаки колес | 3 243 084 | 648 617 |
| 13 | ГАЗ -310290 | 1996 | 3163 | T0489757, черный | 170,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; неисправен замок зажигания, повреждение центральной консоли; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, внутренняя обшивка передней левой двери, магнитола, боковое зеркало заднего вида (правое), боковые повторители поворотов, рукоятка рычага КПП, колпаки колес | 3 330 292 | 666 058 |
| 14 | ГАЗ -310290 | 1996 | 3168 | T0489482, серо-белый | 245,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, коврики, магнитола, рукоятка рычага КПП, подголовники сидений, боковой повторитель поворотов (правый), патрубки системы охлаждения, колпаки колес | 3 241 484 | 648 297 |
| 15 | ГАЗ -310290 | 1997 | 3215 | V0534156, серо-белый | 279,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес; отсутствует: АКБ, коврики, магнитола, ручка стеклоподъемника передней правой двери, молдинги четырех дверей, задняя левая фара, 2 колпака колес, расширительный бачок | 3 269 886 | 653 977 |
| 16 | ГАЗ -310290 | 1997 | 3231 | V0534094, серо-белый | 305,0 | 2,4 | Сильная коррозия кузова, требует замены шин колес, неисправен замок зажигания; отсутствует: АКБ, щетки стеклоочистителя, коврики, магнитола, рукоятка рычага КПП, рычаг переключения указателя поворотов, рычаг стеклоомывателя, противотуманная фара (левая), боковой повторитель поворотов (правый) бочок стеклоомывателя | 3 318 691 | 663 738 |

Порядок проведения аукциона, порядок оформления участия в аукционе, порядок определения победителя аукциона определены Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности, на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238».

Лицо, желающее принять участие в аукционе, подает Организатору аукциона заявление на участие в аукционе.

К подаваемому заявлению прилагаются:

**юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:**

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

**юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:**

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

**индивидуальным предпринимателем:**

документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

**физическим лицом:**

заверенная банком копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе Организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения. Предмет торгов может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Участником аукциона до подачи заявления на участие в аукционе Организатору перечисляется задаток в размере 350 000 белорусских рублей на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Заявления принимаются с 27 июня по 26 июля 2011 г. включительно.**

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня утверждения Организатором аукциона протокола о результатах аукциона, обязан возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается не позднее 2 рабочих дней после возмещения вышеуказанных затрат.

Порядок и срок осмотра транспортных средств установлен и производится Продавцом по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54/35 с 09.00 до 18.00 с понедельника по пятницу по 26 июля 2011 г. включительно.

Контактные тел.: (8017) 200 28 23; (8029) 677 88 87 Гундилович Сергей Сергеевич, Маилянц Владимир Гарриевич; 150 – внутренний номер в учреждении «Белтрансспецавто».

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 21.06.2011 г.

